УДК 262.2

# ПАРАФІІ ПОЛАЦКАГА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА ДЭКАНАТА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**Аўсейчык Юлія Аляксандраўна**
Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік
(г. Полацк, Беларусь)

У артыкуле разглядаецца гісторыя і асноўныя аспекты развіцця парафій Полацкага дэканата ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Прааналізавана структура парафій, колькасць вернікаў, вылучаны асаблівасці дзейнасці святароў.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай на далучаных да Расійскай імперыі землях Беларусі ідзе фарміраванне новых структурных адзінак рымска-каталіцкага касцёла. У 1773 г. была створана Беларуская дыяцэзія, а ў 1782 г. яе перайменавалі ў Магілёўскую і надалі статус архідыяцэзіі. У сваю чаргу дыяцэзіі падзяляліся на дэканаты, а дэканаты – на парафіі. Згодна з крыніцамі, на 1860 г. у склад Полацкага дэканата ўваходзілі Полацкая, Экімана-Дручанская, Рукшаніцкая і Гарбачэўская парафіі [7, s. 91–92].

Полацкі парафіяльны касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі Ружанцовай знаходзіўся на Параднай плошчы ў цэнтры горада. У 1860 г. парафія налічвала 4 630 вернікаў, а галоўным святаром (пробашчам) быў Аляксандр Пятроўскі OP[1], які выконваў і функцыі дэкана (кіраўнік дэканата). Акрамя пробашча, святарамі ў парафіі ў пазначаны перыяд працавалі Карл Сяніцкі, Фелікс Зялёнка, Аўгусцін Сабалеўскі [7, s. 91].

Да 1864 г. у полацкім касцёле працавалі айцы дамініканцы, пасля – дыяцэзіяльныя святары. Апошнім дамініканцам, які выконваў ролю адміністратара полацкага касцёла і дэкана, быў Аляксандр Пятроўскі. Згодна з архіўнымі дадзенымі, напачатку Пятроўскі толькі выконваў абавязкі полацкага дэкана, а ўжо ў лісце ад 22.12.1861 г. архіепіскап Магілёўскі В. Жылінскі адзначаў наступнае: «я утверждаю Вас действительным Деканом сего Деканата» [2, с. 182]. Першым пробашчам у Полацку пасля скасавання ордэну дамініканцаў быў Вінцэнт Юркевіч, які выконваў функцыі адміністратара і дэкана. У дырэкторыуме за 1876 г. адміністратарам і дэканам пазначаны Карл Сяніцкі, вікарыем – Іосіф Сяніцкі (магістр багаслоўя), настаўнікам у Полацкім кадэцкім корпусе – Ян Валінскі [10, s. 117]. У 1885 г. успамінаецца ўсё той жа пробашч К. Сяніцкі, а вось пасада вікарыя ўжо не пазначана. Функцыі пробашча ў гэты перыяд выконвалі: В. Юркевіч, К. Сяніцкі, К. Батура, А. Ваяводскі, Л. Бараноўскі [9, s. 392].

Да Полацкай парафіі належаў філіяльны касцёл, які знаходзіўся ў Шацілаве (20 вёрст ад Полацка). Пабудаваны ён быў у канцы XVIII ст. у імя Св. Мікалая. У 1853 г. быў ужо без святара, а ў 1876 г. пазначаны як былы. Я. Жыскар у 1913 г. у выданні «Nasze koscioly» называе мясцовасць «каталіцкай», бо ў 8-мі вёсках пражывала цалкам каталіцкае насельніцтва. Паколькі касцёла ўжо не існавала, то набажэнствы адпраўляліся ў прыватных памяшканнях. У пачатку XX ст. была спроба полацкага вікарыя Ф. Будзькі пабудаваць капліцу.

1 Літары пасля прозвішча святара абазначаюць прыналежнасць да пэўнага ордэна, OP скарачэнне ад Ordo fratrum praedicatorum, Ордэн прапаведнікаў (дамініканцы).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Акрамя касцёлаў, у Полацкай парафіі былі капліцы ў вв. Арцейкавічы, Сакалішча, Сасняны, Жукава, Залессе, Каз'яны, у Кадэцкім Корпусе, у мар'явіцкім кляштары (да 1867 г.), капліцы на могілках (мураваная капліца Св. Францішка з Ксавэрыі).

Каля Полацка была Экімана-Дручанская парафія Св. Яна Хрысціцеля. Адміністратарам у парафіі быў дыяцэзіяльны ксёндз Ян Жэро. Да 1864 г. душпастырскую працу ў парафіі дапамагалі выконваць айцы дамініканцы. Так, у 1854 г. у касцёле Св. Яна Хрысціцеля сакрамэнт хросту ўдзеляў не толькі адміністратар, але і: Вацлаў Менжык OP, Казімір Кеўліч OP, Гіацынт Семяновіч OP, Дамінік Шыманскі OP, Гандызальф Астапковіч OP. Колькасць ахрышчаных пазначана – 150 [3, с. 1–5].

У 1860 г. Экімана-Дручанская парафія налічвала 628 вернікаў [7, s. 91]. Падчас будоўлі новага касцёла ў 1847–1861 гг., з дазволу арцыбіскупа К. Дмахоўскага набажэнствы праводзіў ксёндз Я. Жэро ў звычайным доме вернікаў парафіі, які належаў дваранам Радзевічам. Новы храм праіснаваў да 1865 г. Згодна з матэрыяламі А. Л. Грывянёва, у 1871 г. Экімана-Дручанскі касцёл узгадваецца толькі як філіяльны [1, с. 174]. А ў дырэкторыуме за 1876 г. такога храма ў Полацкім дэканаце ўжо не існуе [10, s. 117].

Адной з самых вялікіх па колькасці вернікаў была парафія ў Гарбачэве (сучасны Расонскі раён). Яна была далучана да полацкага дэканата толькі ў 1852 г., дагэтуль падпарадкоўвалася себежскаму дэкану. У 1860 г. у парафіі налічвалася 2 870 вернікаў. Святары, якія тут працавалі, абслугоўвалі таксама і 6 капліц (Антонаўка, Краснаполле, Прыхабы, Парэчча, Лашкова, Казімірова) [7, s. 91–92]. Аднак у 1869 г. у парафіі засталіся 3 капліцы: Дзмітраў Мост, Лашкова, Казімірова. Пры гэтым колькасць парафіян з кожным годам павялічвалася; так, у 1876 г. іх было 2 782 чалавек, 1897 г. – 3 200, у 1912 г. – 3 333 [10, s. 117; 4, s. 188; 6, s. 177]. За пазначаны перыяд парафіяй кіравалі: у 1849–1864 гг. – Антоній Кавецкі, у 1865 г. – Юзаф Брэсцкі, у 1865–1866 гг. Антоній Юхновіч, у 1868–1869 гг. – Нікадзім Бароўскі, у 1873–1879 гг. – Ян Штроўп, у 1893–1902 гг. – Юзаф Гурко, у 1902–1905 гг. – Францішак Піняровіч, у 1905–1909 гг. – Юзаф Сенвайціс [8]. У 1862 г. пачалося будаўніцтва новага касцёла за сродкі вернікаў, а ў 1896 г. адбылася кансэкрацыя храма.

Яшчэ адна парафія ў Полацкім дэканаце была ў Рукшаніцах (сучасны Ушацкі раён). Па колькасці вернікаў парафія была невялікай. Так, у 1860 г. налічвалася 562 вернікаў, у 1876 г. – 643, у 1898 г. – 795, у 1912 г. – 605 [7, s. 91; 10, s. 117; 5, s. 234; 6, s. 177]. Адметнасцю дадзенай парафіі з'яўлялася значная колькасць літоўцаў, якія прыехалі, набылі маёнткі ў дадзенай мясцовасці і ўтварылі 4 вёскі. Як адзначае Я. Жыскар, яны захавалі сваю мову і традыцыі, не прымалі змешаных шлюбаў [9, s. 20]. У гэты перыяд у парафіі працавалі наступныя святары: Аўгустын Сабалеўскі, Адам Куроўскі, Францішак Піняровіч. Акрамя касцёла Апекі Найсвяцейшай Панны Марыі ў Рукшаніцах, да парафіі належалі і капліцы ў вв. Тураўляны, Шкірлава, Янова [8].

Такім чынам, да Полацкага дэканата ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адносіліся Полацкая парафія, Экімана-Дручанская парафія, парафіі ў Гарбачэве і Рукшаніцах. Некаторы час функцыянаваў філіяльна касцёл у Шацілаве, які належаў да полацкай парафіі. На працягу даследуемага перыяду колькасць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вернікаў дадзеных парафій узрастала. Так, у полацкім дэканаце ў 1860 г. было 8 690 вернікаў, а ў 1912 г. – 11 153. Значнае павелічэнне католікаў адбылося і ў самім Полацку: з 4 630 у 1860 г. да 7 215 у 1912 г. На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. былі ліквідаваны Экімана-Дручанская парафія і філіяльны касцёл полацкай парафіі ў Шацілаве. Паменшылася і колькасць капліц.

## Літаратура

1. Грывянёў, А. Л. Полацкі касцёл Святога Ружанца і яго парафія ў другой палове XVIII – пачатку XX ст. (па матэрыялах НГАБ) / А. Л. Грывянёў // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. – Мінск, 2012. – Вып. 10. – С. 168–187.

2. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГАБ). – Ф. 3432. Воп. 1. Спр. 15.

3. НГАБ. – Ф. 3432. Воп. 1. Спр. 33.

4. Directorium divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi nec non Ecclesiis Minscensi in annum Domini 1897. – Вильно : Типографія Іосифа Завадзкаго. – S. 270.

5. Directorium divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi in annum Domini 1898. – Вильна : Тип. п.ф. I. Завадзкаго. – S. 317.

6. Directorium divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi nec non pro Minscensi in annum Domini bissextilem 1912. – Санкт-Петербург : С.-Петербургская Губернская Типографія. – S. 172.

7. Directorium Horarum Canonicarum et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi in annum Domini MDCCCLXI. – Vilnae : Typis Josephi Zawadzki, 1860. – S. 136.

8. Fibek, J. OFMCap Horbaczewo – Obytoki (Gorbaczew-Obytoki) – p.w. Sw. Jozefa [Zasoby elektroniczne]. – Tryb dostępu: https://radzima.org/ru/object_comm/7417.html. – Data dostępu: 15.03.2025.

9. Nasze koscioly: [opis ilustrowany wszystkich kosciołow i parafji znajdujących się na obszarach dawnej Polski i ziemiach przyległych] / ułożyli : Dyonizy Bączkowski, Jozafat Żyskar. – Warszawa Petersburg : Piotr Laskauer Pietkowski, 1913. – 443 s.

10. Ordo divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohyloviensi in annum Domini 1877. – Petropolis, 1876. – S. 153.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова